71.1
П 218

Д 119

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

УДК 008(476)(091)(043.3)
ББК[71.11+71.061.2+71.3(4Беи)4+71.3(4Беи)5]я031

**Пацыенка**
**Святлана Аляксандраўна**

# ДЫНАМІКА ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ МАГНАТАЎ БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ

**Аўтарэферат дысертацыі на саісканне**
**вучонай ступені кандыдата культуралогіі**

**па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры**

Репозиторий БГУКИ

Мінск 2011

Работа выканана на кафедры культуралогіі
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Навуковы кіраўнік: **Ігнатовіч Пётр Рыгоравіч,** кандыдат гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры культуралогіі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Афіцыйныя апаненты: **Гарбацкі Андрэй Аляксандравіч,** доктар гістарычных навук, прафесар культуралогіі, прафесар кафедры гісторыі славянскіх народаў УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

**Болатава Юлія Генадзеўна,** кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ПУА «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава»

Апаніруючая арганізацыя: ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»

Абарона адбудзецца 15 верасня 2011 г. а 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» па адрасе: 220007, г.Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: buk@buk.by; тэл. вучонага сакратара 222-83-79.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

Аўтарэферат разасланы 30 чэрвеня 2011 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт В.У. Мазанік

Репозиторий БГУКИ

## КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

Сучасная сацыякультурная сітуацыя характарызуецца ўстойлівай цікавасцю грамадства Беларусі да магнацкай спадчыны. Рэзідэнцыі вядомых арыстакратычных родаў, якія захаваліся да нашых дзён, маюць вялікі культурны патэнцыял і могуць прэтэндаваць на статус паўнавартасных нацыянальных сімвалаў. Актывізацыя інтарэсу і зварот да духоўнай культуры менавіта элітарнай часткі грамадства дэманструе якасна новы ўзровень нацыянальнай свядомасці беларускага грамадства. На дадзеным гістарычным этапе адбываецца пераасэнсаванне культурнага вопыту арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага і вяртанне яго элементаў у сучасную сацыякультурную прастору Беларусі.

Беларускае Панямонне – багаты і разнастайны ў культурным плане гісторыка-этнаграфічны рэгіён. Землі Панямоння, якія з'яўляліся аднымі з самых развітых і густанаселеных ва ўсходнеславянскім свеце ў XIII ст., сталі ядром Вялікага Княства Літоўскага. На названай тэрыторыі ў розныя часы размяшчаліся буйныя магнацкія ўладанні, сярод якіх рэзідэнцыі Агінскіх, Гаштольдаў, Пацаў, Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў і інш. У прыватнаўласніцкіх замках і палацах Слоніма, Любчы, Геранёнаў, Міра, Гальшанаў, Шчорсаў арыстакратамі стваралася ўнікальная самабытная культура.

Духоўная культура магнатаў Беларускага Панямоння з канца XIV ст. да канца XVIII ст. характарызавалася насычанасцю і разнастайнасцю дынамічных працэсаў. Дэтэрмінацыя трансфармацыі гэтай лакальнай сацыякультурнай сістэмы была абумоўлена фактарамі, якія спрыялі варыятыўнасці культурных узораў на землях Панямоння.

Вывучэнне дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння, уключанай у заходнееўрапейскі сацыякультурны кантэкст, набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах сучаснага ўзаемадзеяння Рэспублікі Беларусь з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Каштоўнасць дадзенага даследавання заключаецца ў тым, што яно дазваляе адрэфлексаваць гістарычны вопыт культурных стасункаў Беларусі з еўрапейскім светам і прадставіць яе як паўнавартасны суб'ект агульнаеўрапейскага культурнага працэсу.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**

Дысертацыя з'яўляецца аўтарскай працай, якая выканана ў рамках комплекснай навукова-даследчай праграмы кафедры культуралогіі УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» «Міжкультурная камунікацыя ў кантэксце глабалізацыйных працэсаў» (зацверджана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 21.03.2006 г., пратакол № 7). Даследаванне адпавядае галіновай

праграме «Захаванне і развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь у 2006 – 2010 гг.», зацверджанай калегіяй Міністэрства культуры 30.05.2006 г. (пратакол № 40). Тэма дысертацыі зацверджана Саветам УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» 29.10.2009 г. (пратакол № 2).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** даследавання – выяўленне асаблівасцей дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння.

У адпаведнасці з мэтай даследавання ў дысертацыі вырашаюцца наступныя **задачы:**

– вызначыць сутнасць і характэрныя рысы духоўнай культуры магнатаў як прадстаўнікоў элітарнай меншасці вышэйшага саслоўя;

– вылучыць механізмы дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння;

– выявіць фактары, якія абумовілі дынаміку духоўнай культуры магнатаў у рэгіёне Беларускага Панямоння;

– распрацаваць перыядызацыю развіцця духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння;

– раскрыць сутнасць трансфармацыі культурнай прасторы прыватнаўласніцкіх замкаў Беларускага Панямоння ў кантэксце дынамікі духоўнай культуры магнатаў.

**Аб'ект і прадмет даследавання**

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца духоўная культура магнатаў Беларускага Панямоння як дынамічна развіваючаяся сістэма. **Прадмет даследавання** – сутнасць і спецыфіка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены неабходнасцю выпрацоўкі эфектыўнай стратэгіі развіцця сучаснага беларускага грамадства ў адпаведнасці з яго шматвяковымі культурнымі традыцыямі. Гэта патрабуе глыбокага разумення заканамернасцей развіцця нацыянальнай культуры. Навуковае асэнсаванне дынамікі культуры элітарнай супольнасці ў гістарычным кантэксце дазваляе зразумець многія працэсы, якія сёння адбываюцца ў палітычным, эканамічным, духоўным жыцці грамадства.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Духоўная культура магнатаў уяўляла структураваную сістэму ведаў, нормаў, звычаяў, узораў, уяўленняў, традыцый, каштоўнасных арыентацый, светапоглядных установак, а таксама спецыфічны спосаб светаўспрымання, уласцівы прадстаўнікам арыстакратычных колаў Вялікага Княства Літоўскага. Характэрныя рысы культуры вызначаліся асаблівым тыпам самаідэнтычнасці магнатаў як членаў элітарнай групы. Самаінтэрпрэтацыя ў кантэксце старажытнасці і знакамітасці роду фарміравала адпаведную карціну свету, заснаваную на грунце сямейных каштоўнасцей і традыцый. Усведамленне ўласнай свабоды, ідэя выканання грамадскага абавязку, прытрымліванне пастулатаў маральна-этычнага кодэксу



гонару, шанаванне культу зброі, шчодрасць як арыстакратычная дабрадзейнасць складалі асноўныя каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі магнатаў. Лад жыцця магнатаў меў рэпрэзентатыўна-рэкрэацыйны характар і прадугледжваў актыўную культуратворчую дзейнасць: мецэнацтва, фундацыю і патранаж рэлігійных устаноў, падтрымку мастацтва, пашырэнне асветы.

2. Дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння – сукупнасць змен унутры гэтай культуры ці ва ўзаемадзеянні яе з іншымі культурамі, якія характарызаваліся накіраванасцю, цэласнасцю, наяўнасцю выразных тэндэнцый.

У якасці асноўных механізмаў дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння выступалі традыцыі і навацыі. Зварот да культурнай спадчыны, абумоўлены вернасцю традыцыям роду, шанаваннем культу продкаў, забяспечваў трансляцыю радавых каштоўнасцей прадстаўнікам наступных пакаленняў. Успрыманне мінулага як асобага роду каштоўнасці актуалізавала важнасць захавання духоўнай спадчыны магнацкіх сем'яў. Інтэграцыя навацыйных кампанентаў у духоўную культуру магнатаў выявілася ў адаптацыі форм еўрапейскай культурнай практыкі да мясцовых умоў. Гэта забяспечвалася інтэнсіўнымі кантактамі магнатаў з прадстаўнікамі еўрапейскай арыстакратычнай і творчай эліты, рознымі відамі міжкультурных узаемадзеянняў (атрыманне адукацыі ў еўрапейскіх культурна-адукацыйных цэнтрах, канфесійнае ўзаемадзеянне, паступовае далучэнне да лацінскай і польскай моўных традыцый і інш.).

3. Развіццё духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння было дэтэрмінавана комплексным уздзеяннем геаграфічнага, этнічнага, палітычнага, эканамічнага, канфесійнага, сацыяльнага фактараў. Спрыяльнае геапалітычнае становішча садзейнічала ўмацаванню эканомікі рэгіёну, што стварала ўмовы для актыўнага развіцця духоўнай сферы, а таксама давала магнатам магчымасць большай свабоды ў выбары сродкаў рэпрэзентацыі свайго светапогляду. Неаднародны этнічны склад жыхароў рэгіёну спрыяў фарміраванню рэгіянальнага тыпу культуры, асаблівасці якой складваліся ў выніку актыўных міжкультурных сувязяў. Ускладненню структуры каштоўнасна-сэнсавага ядра культуры магнатаў садзейнічала поліканфесійная сітуацыя (суіснаванне каталіцкага, праваслаўнага, пратэстанцкага і іншых веравызнанняў). Гэта спрыяла актывізацыі дынамічных працэсаў і паскарэнню тэмпаў культурнага развіцця рэгіёну.

4. Духоўная культура магнатаў Беларускага Панямоння прайшла наступныя этапы ў працэсе развіцця: фарміраванне (канец XIV–XV ст.), росквіт (XVI–XVII стст.) і трансфармаванне (XVIII ст.).

Этап фарміравання характарызаваўся імкненнем да традыцыйнасці (станаўленне традыцый княжацка-дружыннай супольнасці; актуалізацыя дамінуючай пазіцыі рэлігіі ў выніку інстытуалізацыі хрысціянства і інш.). З пашырэннем міжкультурных камунікатыўных працэсаў у XVI ст. актывізавалася пранікненне запазычанняў у культуру магнатаў. На этапе росквіту назіралася адносная



Рэпазіторый БДУКіМ

гарманізацыя традыцыйных і запазычаных элементаў. Далейшае пашырэнне запазычанняў прывяло да памяншэння ўплыву традыцыйных уяўленняў, установак, норм на фарміраванне светапогляду магнатаў. Вынікам дысбаланса культурных традыцый і навацый у XVIII ст. стала актывізацыя дэструктыўных тэндэнцый: змена каштоўнасных арыенціраў, узмацненне канфрантацыйных настрояў унутры магнацкай групы, крызіс маралі і традыцыйных рэгулятыўных механізмаў. Разам з тым, з паскарэннем тэмпаў культурнай дыфузіі пашырылася індывідуальная культурна-інавацыйная дзейнасць магнатаў. У новых умовах культуратворчыя ініцыятывы Агінскіх, Пацаў, Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў і інш. спрыялі мадэрнізацыі традыцыйных відаў і форм культуры.

5. Дынаміка духоўнай культуры магнатаў адлюстравалася ў арганізацыі культурнай прасторы прыватнаўласніцкіх замкаў Беларускага Панямоння, якая ўяўляла сабой спецыфічны спосаб канструявання сацыякультурнай рэальнасці. У выніку культуратворчай дзейнасці магнатаў замкі з абаронных аб'ектаў (XIV – XV стст.) эвалюцыянавалі да сацыякультурных цэнтраў, якія прадстаўлялі элітарны варыянт мастацкага асэнсавання свету (XVI – XVIII стст.).

Увасабляючы светапоглядную парадыгму магнатаў, культурная прастора замкаў адлюстравала ўласцівую ім карціну свету, каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі, лад жыцця: архівы выступалі знакам старажытнасці паходжання, партрэтныя галерэі продкаў – высакародства, арсеналы, трафеі і зброя ў інтэр'ерах – вайсковай адвагі, скарбніцы – багацця, наяўнасць прыватных гарнізонаў – палітычнай незалежнасці і г.д. Прастора прыватнаўласніцкіх замкаў аб'ядноўвала арыстакратаў з іх продкамі ў адзіным культурным полі магнацкага роду, спрыяла падтрыманню культу сямейных каранёў, забяспечвала трансляцыю радавых каштоўнасцей і традыцый у часе.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыя з'яўляецца вынікам самастойных навуковых пошукаў дысертанта і першым у айчыннай навуцы комплексным тэарэтыка-культуралагічным даследаваннем дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння. У дысертацыйным даследаванні аўтарам упершыню:

- вызначана сутнасць і характэрныя рысы духоўнай культуры магнатаў як прадстаўнікоў элітарнай меншасці вышэйшага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага;
- вылучаны традыцыі і навацыі як асноўныя механізмы дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння;
- устаноўлены асноўныя фактары дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння;
- прапанавана аўтарская перыядызацыя развіцця духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння і характарыстыка асноўных яе этапаў;
- здзейснена тэарэтычная рэканструкцыя культурнай прасторы прыватнаўласніцкіх замкаў Беларускага Панямоння ў кантэксце дынамікі духоўнай культуры магнатаў.



**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Вынікі даследавання на розных яго этапах былі прадстаўлены ў выглядзе дакладаў на 5 міжнародных, 3 рэспубліканскіх і 5 вузаўскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: «Асноўныя навуковыя і творчыя пошукі моладзі ў пачатку XXI ст.» (Мінск, 22 красавіка 2001 г.); «Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе» (Гродна, 15 –16 лістапада 2001 г.); «Асноўныя навуковыя і творчыя пошукі моладзі ў пачатку XXI ст.» (Мінск, 24 красавіка 2002 г.); «Асноўныя навуковыя і творчыя пошукі моладзі ў пачатку XXI ст.» (Мінск, 22 красавіка 2003 г.); «Матэрыяльная і духоўная культура замкаў Беларусі» (г.п. Мір Карэл. р-на Гродзен. вобл., 30 мая 2003 г.); «Чалавек. Культура. Адукацыя» (Мінск, 14 – 15 лістапада 2003 г.); «Прырода, чалавек, культура: праблемы гармоніі» (Мінск, 25 – 26 сакавіка 2003 г.); «Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе» (Гродна, 5 –6 чэрвеня 2003 г.); «Чалавек і культура: праблемы гармоніі» (Мінск, 21–26 красавіка 2004 г.); «Содружество наук. Барановичи – 2005» (Баранавічы, 22 лютага 2005 г.); «Культура Беларусі ў сусветнай культурнай прасторы: традыцыйныя каштоўнасці і праблемы сучаснасці» (Мінск, 20 красавіка 2006 г.); «Мірскі замак. Канцэпцыя рэстаўрацыі і праблемы музеефікацыі» (г.п. Мір Карэл. р-на Гродзен. вобл., 16 чэрвеня 2007 г.); «Культура ва ўмовах глабалізацыі» (Мінск, 25 – 26 лістапада 2009 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 16 публікацыях: 5 артыкулах у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (2,9 аўтарскага аркуша), 1 артыкуле ў навуковым часопісе, 1 артыкуле ў навуковым зборніку, 9 матэрыялах навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 5,7 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох раздзелаў, шасці падраздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу.

Агульны аб'ём дысертацыі – 124 старонкі, з іх 100 старонак – асноўны тэкст, 24 старонкі – бібліяграфічны спіс, які складаецца са спісу выкарыстаных крыніц (321 найменне на беларускай, рускай, польскай мовах) і спісу публікацый аўтара (16 найменняў на беларускай і рускай мовах).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах і агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, яе актуальнасць, раскрываецца навуковая навізна, вызначаюцца мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання; фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону; раскрываецца асабісты ўклад саіскальніка,



Репозиторий БГУКИ

адлюстроўваюцца звесткі аб апрабацыі і апублікаванасці вынікаў дысертацыі, яе структура і аб'ём.

У першым раздзеле **«Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння»**, які складаецца з двух падраздзелаў, аўтарам вызначаюцца асноўныя паняцці, што выкарыстоўваюцца ў даследаванні, напрамкі папярэдняга вывучэння духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння, адзначаецца спецыфічнасць культурных працэсаў у дадзеным гісторыка-этнаграфічным рэгіёне.

Падраздзел 1.1 ***«Канцэптуальныя прынцыпы даследавання»*** уключае ацэнку ступені распрацаванасці праблемы, абгрунтаванне тэарэтыка-метадалагічных прынцыпаў даследавання. У падраздзеле акрэсліваюцца пытанні, якія патрабуюць навуковага асэнсавання, разглядаюцца ключавыя аспекты інтэрпрэтацыі феномена духоўнай культуры арыстакратыі, вызначаецца паняцце «дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння».

Разнастайнасць працэсаў дынамікі, іх шматварыянтнасць, шматвектарнасць ускладняюць працэс вывучэння. На думку аўтара, павышэнню эфектыўнасці даследавання дынамікі духоўнай культуры садзейнічае стварэнне класіфікацыі асноўных яе працэсаў па наступных крытэрыях: стадыяльнасць развіцця (культурагенез, культурная эвалюцыя, культурны заняпад і інш.), характар узаемадзеянняў унутры адной або паміж некалькімі культурамі (акультурацыя, культурная акумуляцыя, культурная дыфузія, культурная трансмісія, культурны сінтэз і інш.), якасная характарыстыка ўнутры- і міжкультурных змяненняў (культурная дэградацыя, культурны выбух, культурны застой, культурны крызіс, культурны прагрэс і інш.).

У сусветнай навуковай думцы назапашаны вялікі аб'ём ідэй і канцэпцый інтэрпрэтацыі дынамікі культуры. Спецыфічнасць культурных працэсаў, а таксама індывідуальна-аўтарскае бачанне праблемы развіцця культурна-гістарычнага працэсу абумовілі ўзнікненне шэрага тэорый дынамікі культуры. Канцэптуальная разнастайнасць падыходаў да вывучэння працэсаў першай групы, якія адлюстроўваюць стадыяльнасць развіцця культуры, можа быць умоўна падзелена на некалькі асноўных кірункаў: цыклічны (М. Данілеўскі, А. Моль, А. Тойнбі, О. Шпэнглер), лінейны (К. Ясперс), эвалюцыйны (Л. Морган, Г. Спэнсэр, Дж. Фрэзер), сінергетычны (І. Валерстайн, М. Каган, А. Князева, С. Курдзюмаў, М. Мажэйка). Даследаванні працэсаў гэтай групы грунтуюцца на гісторыка-фактaлагічным матэрыяле, што абумоўлена тэмпаральнай спецыфікай характару змяненняў.

Даследаванне групы працэсаў, якія адлюстроўваюць характар узаемадзеянняў унутры адной або паміж некалькімі культурамі, у значнай ступені адбывалася ў межах антрапалогіі і сацыялогіі. Разнастайныя тыпы культурных змяненняў даследаваліся Ф. Боасам, Ф. Грэбнерам, Т. Парсансам і інш. Праблема якаснай



характарыстыкі дынамічных працэсаў закранлася ў працах Х. Артэга-і-Гасэта, Ю. Лотмана, П. Сарокіна, А. Тойнбі, А. Фліера, Й. Хёйзінгі і інш.

У падраздзеле 1.2 ***«Агляд літаратуры і метадалогія даследавання»*** прасочаны этапы развіцця айчыннай і замежнай навуковай думкі па праблемах арыстакратычнай культуры, акрэслены асноўныя падыходы да вывучэння духоўнай культуры як арыстакратыі ў цэлым, так і магнатаў Беларускага Панямоння ў прыватнасці.

Феномен арыстакратыі ў творчасці розных мысліцеляў актуалізаваўся ў разнастайных канцэптуальных кірунках. Да першага аўтар адносіць разгляд арыстакратыі ў кантэксце праблемы ўлады (творы Ф. Аквінскага, Канфуцыя, Т. Карлейля, Н. Макіявелі і інш.). Другі кірунак прадугледжвае інтэрпрэтацыю феномену арыстакратызму з пазіцый «выключнай асобы», што было характэрна для творчасці Ф. Ніцшэ, які сфармуляваў канцэпцыю «звышчалавека». Да гэтага кірунку набліжаліся погляды М.Бярдзяева. У адпаведнасці з трэцім падыходам арыстакратыя разглядалася як творчая меншасць (працы А. Тойнбі, А. Шапэнгаўэра, О. Шпэнглера і інш.). Дыхатамія эліта–масы як прадмет даследаванняў мысліцеляў чацвёртага кірунку аналізавалася ў творах Т. Вэблена, К. Манхейма, Р. Мілса, Н. Эліаса і інш.

Даследаванню трансфармацыі арыстакратычнага светапогляду ў кантэксце сацыякультурнай дынамікі сярэдневечнай еўрапейскай культуры прысвечаны шэраг прац гісторыка-антрапалагічнага кірунку (работы М. Асоўскай, М. Блока, А. Гурэвіча, Ж. Дзюбі, Ж. Ле Гофа, М. Пастура, Ж. Руа).

У дысертацыі адзначаецца, што вывучэнне духоўнай культуры магнатаў Панямоння праводзілася пераважна ў кантэксце агульнай гісторыі Беларусі. Асноўная частка даследаванняў XIX ст. закранала дзяржаўна-палітычную, сацыяльна-эканамічную, царкоўна-рэлігійную сферы жыцця арыстакратыі (працы М. Балінскага, А. Кіркора, Ц. Ліпінскага, Т. Нарбута, Ю. Нямцэвіча і інш.). Даследчыкі XX ст. звярнуліся да вывучэння такіх аспектаў культуры магнатаў, як іх гістарычная роля ў палітычным жыцці краіны (Г. Галенчанка, А. Грыцкевіч, П. Лойка, Г. Сагановіч); праблемы генеалогіі магнацкіх родаў (А. Грыцкевіч, В. Насевіч і інш.); асаблівасці матэрыяльнай культуры вышэйшага саслоўя (Г. Барвенава, В. Пазднякоў і інш.); культурная спадчына роду Радзівілаў (В. Бажэнава, А. Латушкін і інш.).

**Метадалагічная аснова** дысертацыі грунтуецца на сістэмным падыходзе, які даў магчымасць інтэграваць фактaлагічны матэрыял па духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння, назапашаны ў розных галінах гуманітарных ведаў. Дысертацыйнае даследаванне было праведзена з выкарыстаннем наступных метадаў: 1). структурна-функцыянальнага метаду, прымяненне якога дазволіла аўтару раскрыць складаны характар дынамічных унутры- і міжкультурных працэсаў; 2). метаду гістарычнай рэканструкцыі, які даў магчымасць разгледзець культуру магнатаў Беларускага Панямоння ў яе дынаміцы і выявіць фактары, якімі яна была



Рэпазіторый БГУКІ

дэтэрмінавана; 3) дыялектычнага метаду, які дазволіў выявіць агульнае і асаблівае ў розных гістарычных формах культуры магнатаў Беларускага Панямоння.

У працэсе даследавання гістарычнай разнастайнасці і варыятыўнасці развіцця духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння аўтарам былі прыняты да ўвагі распрацоўкі айчынных даследчыкаў Я. Бабосава, Ю. Болатавай, А. Гарбацкага, А. Данілава, Э. Дарашэвіча, П. Ігнатовіча, Л. Кажухоўскай, У. Конана, С. Куль-Сяльвёрставай, А. Лапцёнка, С. Падокшына, А. Смоліка, Ю. Чарняўскай, Н. Шалупенка, І. Шыршова і інш.

Другі раздзел дысертацыйнага даследавання – **«Духоўная культура магнатаў Беларускага Панямоння: сутнасць і спецыфіка фарміравання і развіцця»** – прысвечаны выяўленню сутнасці духоўнай культуры магнатаў, яе характэрных рыс, асаблівасцей працэсаў фарміравання і развіцця, вызначэнню механізмаў і фактараў дынамікі.

У падраздзеле 2.1 ***«Характэрныя рысы духоўнай культуры магнатаў»*** вызначаецца сутнасць духоўнай культуры магнатаў, якую аўтар разумее як структураваную сістэму ведаў, нормаў, звычаяў, узораў, уяўленняў, традыцый, каштоўнасных арыентацый, светапоглядных установак, а таксама спецыфічны спосаб светаўспрымання, уласцівы прадстаўнікам арыстакратычных колаў Вялікага Княства Літоўскага.

Характэрныя рысы культуры магнатаў вызначаліся спецыфічным тыпам самаідэнтычнасці магнатаў, у адпаведнасці з якім яны ўспрымалі сябе як членаў элітарнай супольнасці ў межах вышэйшага саслоўя. Інтэрпрэтацыя магнатаў як прадстаўнікоў пэўнай супольнасці дазволіла аўтару разглядаць іх культуру ў якасці субкультурнага ўтварэння. У адпаведнасці з тэорыяй субкультурнай стратыфікацыі карціна свету носьбітаў пэўнай субкультуры ўтрымлівае ўяўленні аб іх месцы ў структуры светабудовы, рэлігіі, прасторы і часе, гісторыі, сацыяльным цэлым і яго структурах, прыродзе і сродках уздзеяння на яе.

Карціна свету магнатаў грунтавалася на ўсведамленні ўласнай значнасці як членаў старажытнага і знакамітага роду. У сям'і на першых этапах фарміравання асобы закладваліся паняцці магутнасці роду і велічы продкаў, уласнай годнасці, прызначэння ў служэнні дзяржаве і г.д. Успрыманне рэлігіі, з аднаго боку, характарызавалася паважлівым богабаязным стаўленнем, а з іншага – адбывалася ў кантэксце свецкага жыцця, што абумовіла «супрацоўніцкі» характар узаемаадносін з рэлігійнымі ўстановамі (фундацыя, патранаж, данатарства і інш.). Прастора і час разглядаліся ў кантэксце гісторыі роду: цэнтрам з'яўляўся замак – месца лакалізацыі гісторыі і культуры магнацкай сям'і. Узаемаадносіны з соцыумам будаваліся з пазіцый групавой ідэнтычнасці і карпаратыўнага гонару магнацкай супольнасці, усведамлення іх перавагі над прадстаўнікамі іншых сацыяльных груп.

Аўтар прыходзіць да высновы, што каштоўнасна-сэнсавыя ўстаноўкі культуры магнатаў уключалі паняцці арыстакратычнага кодэксу гонару, каштоўнасці ўлады,



свабоды, адукаванасці, шчодрасці. Кодэкс гонару рэгуляваў адносіны ў асяроддзі магнатаў і вызначаў комплекс патрабаванняў да асобы арыстакрата. Прадугледжвалася, што апошні павінен абараняць Айчыну, свой гонар і гонар блізкіх яму людзей, быць смелым ваяром, прытрымлівацца пастулатаў вайсковай этыкі: быць велікадушным да пераможаных, паважаць роўных сабе па паходжанні, выконваць абяцанні і інш. Будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў як гарантаў палітычнай незалежнасці магнатаў адлюстравала асаблівае значэнне каштоўнасці ўлады і свабоды. Высокія патрабаванні да асобы магната ўзнімалі значнасць адукацыі, атрыманне якой з'яўлялася абавязковым і адбывалася ў працэсе наведвання еўрапейскіх універсітэтаў. Дэманстрацыя шчодрасці як арыстакратычнай каштоўнасці праяўлялася ў арганізацыі ўрачыстых мерапрыемстваў, застолляў, адорванні гасцей падарункамі і інш.

У падраздзеле 2.2 ***«Механізмы і фактары дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння»*** праводзіцца аналіз працэсаў зменлівасці культуры на розных гістарычных этапах, выяўляюцца механізмы дынамікі і фактары, якія абумовілі змены.

Дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння характарызавалася разнастайнасцю тэмпаў і рытмаў. У розныя гістарычныя перыяды працэсы змен актывізаваліся альбо запавольваліся. Глыбіня змяненняў, ступень іх уплыву, накіраванасць залежалі ад механізмаў культурнай дынамікі.

Дынаміка духоўнай культуры магнатаў адбывалася пры дапамозе двух асноўных механізмаў:

1) на аснове традыцый і здабыткаў культурнай спадчыны шляхам звароту да назапашанага вопыту, адбору яго найбольш адпаведных канкрэтным умовам форм і іх інтэрпрэтацыі;

2) у выпадку ўзнікнення навацый або запазычання культурных узораў у іншых сацыякультурных сістэмах шляхам адаптацыі новых культурных форм да патрэбаў асяроддзя.

У культуры магнатаў Беларускага Панямоння традыцыі выконвалі інтэгратыўную функцыю, аб'ядноўваючы членаў гэтай супольнасці на аснове агульнага светаўспрымання, карціны свету, каштоўнасна-сэнсавых установак і інш. Выкарыстанне назапашаных папярэднімі пакаленнямі ўзораў, духоўных каштоўнасцей, сімвалаў, сэнсаў культуры спрыяла ўстойлівасці сувязей унутры супольнасці. Разам з тым, змены ў розных сферах сацыяльнага жыцця выклікалі неабходнасць мадэрнізацыі культурнага вопыту продкаў з мэтай прывядзення яго ў адпаведнасць з новай сітуацыяй. У гэтым выпадку ўзнікненне навацый з'яўлялася кампліментарным традыцыйнаму варыянту развіцця культуры.

Аналіз суадносін традыцый і навацый у духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння дазволіў аўтару выявіць наступную заканамернасць:



Репозиторий БГУКИ

развіццё культуры насіла прадуктыўны характар у выпадку, калі ўзаемадзеянне традыцый і навацый знаходзілася ў збалансаваным спалучэнні.

Разнастайнасць духоўнага жыцця была абумоўлена працэсамі, якія адбываліся не толькі ў культурнай, але і ў палітычнай, сацыяльнай, рэлігійнай і іншых сферах. Спалучэнне комплекса фактараў забяспечвала шматстайнасць культуры і інварыянтнасць яе ўзораў, а іх узаемадзеянне, у сваю чаргу, спрыяла далейшаму ўскладненню структур і канфігурацый у яе межах.

У працэсе даследавання дысертант прыходзіць да высновы, што асноўнымі фактарамі, якія абумоўлівалі развіццё духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння, былі геаграфічны, этнічны, палітычны, эканамічны, канфесійны, сацыяльны. Спецыфіка геаграфічнага размяшчэння земляў Беларускага Панямоння спрыяла актыўным міжкультурным і міжэтнічным узаемадзеянням у рэгіёне. У выніку неаднароднасці этнічнага складу жыхароў, ва ўмовах сінтэзу традыцый на тэрыторыі Беларускага Панямоння сфарміраваўся своеасаблівы рэгіянальны тып культуры. У XIII ст. на час існавання сталіцы ў Навагрудку Панямонне набыло статус цэнтральнага рэгіёну Вялікага Княства Літоўскага, што актывізавала палітычнае, эканамічнае і культурнае развіццё дадзенай тэрыторыі.

Як адзначаецца ў даследаванні, значным фактарам трансфармавання духоўнай культуры магнатаў на працягу ўсяго часу існавання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, было памежнае (а з 1569 г. – саюзнае) суіснаванне з Польскім Каралеўствам. Не адмаўляючы значнасці іншых агульнасацыяльных і сацыяльна-эканамічных фактараў, якія мелі значэнне ў дэтэрмінацыі культуры гэтага рэгіёну, а таксама якасці ўнутраных рэсурсаў магнацкай супольнасці, аўтар падкрэслівае фактар тэрытарыяльнай блізкасці з больш дасканалай сацыякультурнай сістэмай.

Польскае Каралеўства выступала як пасрэднік, культурная прастора якога з'яўлялася месцам адаптацыі еўрапейскіх узораў да культурнага ўзроўню Вялікага Княства Літоўскага. Прымаючы да ўвагі той факт, што эфектыўнасць культурных працэсаў зніжаецца ад цэнтра да перыферыі, аўтар прыходзіць да высновы, што заходнееўрапейскія культурныя тэндэнцыі найбольш інтэнсіўна праяўляліся на землях Вялікага Княства Літоўскага менавіта на тэрыторыі Панямоння. У выніку гэтага ў культуры рэгіёну актыўна працякалі дыфузныя працэсы, якія яшчэ больш узмацняліся спецыфічнай канфесійнай сітуацыяй. З сярэдзіны XVI ст. магнаты пачалі адчуваць уплыў ідэй Рэфармацыі і Контррэфармацыі, што з'явілася стымулам для змен у духоўнай культуры.

У трэцім раздзеле **«Трансфармацыі ў культурным асяроддзі магнатаў Беларускага Панямоння»** раскрываюцца істотныя для дадзенага даследавання формы змен духоўнай культуры ў каардынатах часу і прасторы. Раздзел утрымлівае храналагічны аналіз этапаў развіцця культуры магнатаў, аналіз трансфармацыі культурнай прасторы прыватнаўласніцкіх замкаў як цэнтраў гісторыі магнацкіх



родаў, навуковае асэнсаванне культуратворчай дзейнасці магнатаў ва ўмовах трансфармацыі.

У падраздзеле 3.1 ***«Асноўныя этапы развіцця духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння»*** праводзіцца аналіз змен духоўнай культуры магнатаў у часе, на падставе якога аўтарам была створана перыядызацыя яе развіцця. Адпаведна былі вылучаны наступныя этапы: фарміраванне (канец XIV – XV стст.), росквіт (XVI – XVII стст.), трансфармаванне (XVIII ст.).

Нягледзячы на тое, што фарміраванне духоўнай культуры магнатаў храналагічна адносіцца да канца XIV ст., яна прадоўжыла арыстакратычныя традыцыі, якія склаліся на землях Беларускага Панямоння ў больш ранні перыяд. Функцыю духоўнага лідэрства ў культуры IX – XIII стст. выконвалі высакародныя прадстаўнікі княжацка-дружыннай супольнасці. Духоўная спадчына вайсковай эліты Панямоння аказала значны ўплыў на фарміраванне каштоўнасна-сэнсавага ядра культуры магнатаў гэтага рэгіёну. Так, у сістэме іх каштоўнасцяў прысутнічаў ідэал ваяра, дамінавалі паняцці «высакародства паходжання», «гонар», «улада» і інш.

Фарміраванне асноўных рыс духоўнай культуры арыстакратыі Беларускага Панямоння адбывалася ва ўмовах умацавання Вялікага Княства Літоўскага. У адпаведнасці з феадальна-сярэднявечнай традыцыяй у карціне свету магнатаў дамінавалі ўяўленні аб значнасці асабістых якасцей арыстакрата як ваяра-абаронцы Айчыны, неабходнасці прытрымлівацца прынцыпаў хрысціянскага веравучэння. У гэты перыяд пачалі складвацца традыцыі знатных арыстакратычных родаў як элітарных супольнасцей. Аўтар падкрэслівае, што культура гэтага этапу характарызавалася імкненнем да традыцыйнасці.

На этапе росквіту духоўнай культуры магнатаў павялічылася інтэнсіўнасць працэсаў запазычанняў. Актыўныя міжкультурныя ўзаемадзеянні, якія актывізаваліся ў выніку заключэння Люблінскай уніі з Каралеўствам Польскім, пашырэння ідэй Рэфармацыі і Контррэфармацыі, забяспечвалі першачарговае знаёмства з навацыямі, што распаўсюджваліся з Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Росквіт духоўнай культуры магнатаў суправаджаўся прыняццем ідэалогіі сарматызму. У сарматызме сканцэнтраваўся галоўны змест духоўнай культуры магнатаў, яе асноўныя ідэі, якія заключаліся ў шанаванні продкаў, павазе роўных сабе па паходжанні, выкананні грамадскага абавязку, захаванні традыцый і інш. Нашчадак сарматаў павінен быў адзначаць сямейныя ўрачыстасці і рэлігійныя святы, быць шчодрым і гасцінным, насіць сармацкае адзенне, валодаць зброяй і інш.

У XVII ст. у сістэме каштоўнасцей магнатаў побач з высакародствам і старажытнасцю паходжання, знатнасцю замацаваліся паняцці адукаванасці і свецкасці. Магнаты актыўна імкнуліся рэпрэзентаваць сябе, што актуалізавала стварэнне ўласнай культурнай прасторы. На прыкладзе такіх культуратворчых ініцыятыў, як будаўніцтва прыватнаўласніцкіх замкаў, стварэнне карцінных галерэй,



Репозиторий БГУКИ

калекцыянаванне, пашырэнне кнігадрукавання аўтар разглядае дынаміку духоўнай культуры магнатаў на этапе яе росквіту.

Этап трансфармавання духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння пачаўся ў XVIII ст. і характарызаваўся нераўнамернасцю развіцця розных сфер сацыяльнай жыццядзейнасці. У палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, ідэалагічнай сферахназіраліся крызісныя тэндэнцыі. Разам з тым, актывізавалася культуратворчая дзейнасць некаторых магнатаў, якая праявілася ў падтрымцы інтэлектуальна-творчай эліты, стварэнні прыватнаўласніцкіх тэатраў, музычных капэл, адкрыцці музычна-адукацыйных устаноў і інш. Аднак, як паказана ў даследаванні, высокая ступень дыферэнцыраванасці вышэйшага саслоўя, узмацненне дысбаланса традыцый і навацый (адсутнасць трывалых сувязяў з мясцовай культурай, захапленне іншаземнымі ўзорамі), нізкі ўзровень адаптацыі да трансфармацыйных працэсаў у новых сацыяльна-палітычных умовах зрабілі немагчымым паспяховае пераадоленне крызісу.

Уключэнне зямель Панямоння ў склад Расійскай Імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай кардынальна змяніла культурную сітуацыю. Заходні ўплыў Каралеўства Польскага з яго сталымі традыцыямі рыцарства, арыстакратызму быў спынены. На працягу XIX ст. назва «магнаты» канчаткова выцеснілася русіфікаваным тэрмінам «дваранства», што адлюстравала сутнасць працэсаў трансфармацыі ў культуры арыстакратыі.

У падраздзеле 3.2 ***«Культурная прастора замкаў і палацаў Беларускага Панямоння ў кантэксце дынамікі духоўнай культуры магнатаў»*** адлюстравана ўспрыманне магнатамі ўзаемасувязі часавых і прасторавых адносін на прыкладзе арганізацыі іх жыллёвага ўніверсума – «радавога гнязда». Як адзначае аўтар, у культурнай прасторы прыватнаўласніцкіх замкаў быў сканцэнтраваны духоўны патэнцыял магнацкіх родаў.

Перыяд росквіту духоўнай культуры магнатаў азнаменаваўся ўздымам прыватнаўласніцкага замкавага будаўніцтва. Архітэктура замкаў XVI – пачатку XVII ст. адлюстроўвала не толькі агульнамастацкія тэндэнцыі, але і ўласныя прыхільнасці магнатаў. Гэты перыяд стаў пікам праяўлення індывідуальнасці ў архітэктуры Беларускага Панямоння. Інтэр'еры, планіроўка і прызначэнне прасторы павінны былі цалкам адпавядаць густам гаспадароў – канкрэтных гістарычных асоб.

Прыватнаўласніцкія замкі ствараліся для дэманстрацыі, іх архітэктура маляўніча суадносілася з навакольным асяроддзем, значна ўзмацніўся кантакт замкавай пабудовы са знешнім ландшафтам, узрасла роля эстэтычнага боку гэтага кантакту. У магнацкіх уладаннях пачалі будавацца асветніцкія рэкрэацыйна-забаўляльныя аб'екты (тэатры, мастацкія школы і інш.).

Аўтар падкрэслівае, што ў культурнай прасторы рэзідэнцый як у асноўным месцы існавання духоўнай культуры магнатаў, актуалізавалася іх спецыфічная карціна свету. Замак выступаў як сімвал магутнасці і ўлады: дасканалыя сістэмы



ўмацаванняў, фартыфікацыйныя збудаванні, наяўнасць уласнага войска гарантавалі незалежнасць феадала і дазвалялі актыўна ўплываць на палітычную сітуацыю ў рэгіёне. Адначасова ўладанне замкам з'яўлялася паказчыкам статуса ў арыстакратычным грамадстве, таму што дазваляла магнату прэтэндаваць на атрыманне тытула. Увасабленнем старажытнасці паходжання арыстакратычнага роду выступалі архівы, у якіх утрымліваліся не толькі доказы гэтай старажытнасці, але і дакументы, якія сведчылі пра высокае сацыяльнае становішча магнатаў. Падобную функцыю выконвалі партрэтныя галерэі продкаў, якія рабілі відавочнай гісторыю роду, дэманстравалі адносіны сваяцтва з прадстаўнікамі іншых арыстакратычных сем'яў, захоўвалі радавую памяць. Доказам высокай ступені адукаванасці, шырыні і прагрэсіўнасці поглядаў выступалі бібліятэкі, якія ўтрымлівалі выдадзеныя ў розныя часы і на розных мовах кнігі. Памяшканні скарбніц, дзе захоўваліся разнастайныя каштоўнасці і рарытэты, дэманстравалі багацце. Будынкі тэатраў адлюстроўвалі схільнасць сваіх уладароў да мастацтваў. Усе пералічаныя элементы служылі знакамі высокага арыстакратычнага становішча, сцвярджалі гэты статус у прасторы і часе.

Як паказана ў даследаванні, у выніку культуратворчай дзейнасці арыстакратыі прыватныя ўладанні пашырылі свае функцыі і трансфармаваліся ў буйныя сацыякультурныя асяродкі. Магнаты выступалі ініцыятарамі інтэнсіўных працэсаў якаснага змянення культуры Беларускага Панямоння, яе ўзбагачэння не толькі шляхам пераасэнсавання гістарычнай спадчыны, але і ў выніку запазычванняў. Гэта праявілася ў распаўсюджванні на землях Беларускага Панямоння прагрэсіўных ідэй і феноменаў заходнееўрапейскай культуры. Культуратворчая дзейнасць высокаадукаваных прадстаўнікоў магнатэрыі, падтрымка імі разнастайных творчых ініцыятыў, пашырэнне новых поглядаў спрыялі актыўнаму развіццю земляў Беларускага Панямоння.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Духоўная культура магнатаў з'яўлялася цэласнай структурай, якая ўтрымлівала філасофска-светапоглядны, рэлігійны, інтэлектуальны, маральны, прававы, мастацкі кампаненты. Галоўнае прызначэнне духоўнай культуры заключалася ў стварэнні, успрыманні, інтэрпрэтацыі, захаванні і трансляцыі духоўных узораў і каштоўнасцей рознымі пакаленнямі буйных свецкіх землеўладальнікаў высакароднага паходжання.

Характэрнымі рысамі духоўнай культуры магнатаў з'яўляліся свецкасць (як апазіцыя рэлігійнаму светапогляду), публічнасць (наданне падзеям прыватнага жыцця характару публічных акцый), дэманстратыўнасць (культуратворчая дзейнасць з мэтай праслаўлення сябе і свайго роду), мемарыяльнасць (успрыманне гісторыі як



Репозиторий БГУКИ

каштоўнасці, імкненне захаваць памяць пра сябе), высокая ступень маральнай адказнасці (усведамленне асабістай адказнасці за выкананне грамадскага абавязку). Сацыякультурная практыка магнатаў характарызавалася геданістычна-рэкрэацыйнай накіраванасцю (напаўненне побыту прадметамі раскошы, папулярнасць гульнявых форм дзейнасці) і наяўнасцю этыкетна-цырыманіяльнай арганізацыі камунікатыўнага працэсу (строга рэгламентаваны рытуальны парадак здзяйснення зносін паміж прадстаўнікамі магнацкай супольнасці) [4; 5; 13; 16].

2. Дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння ўяўляла сабой усе віды змен у культуры прадстаўнікоў элітарнай меншасці феадальнага саслоўя азначанага рэгіёну, якія характарызаваліся накіраванасцю, цэласнасцю, наяўнасцю выразных тэндэнцый. Дынаміка праяўлялася ва ўзаемадзеянні і ўзаемаўплывах духоўнай культуры магнатаў з іншымі культурамі і культурнымі канфігурацыямі, якія аказвалі на яе або самі падвяргаліся яе трансфармацыйным уздзеянням.

Асноўнымі механізмамі дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння з'яўляліся традыцыі і навацыі. Значнасць традыцыі як акумулятара базавых каштоўнасцей духоўнай культуры магнатаў заключалася ў захаванні і інтэграцыі здабыткаў культурнай спадчыны папярэдніх пакаленняў магнатаў у актуальную сацыякультурную практыку, забеспячэнні пераемнасці культурных норм, звычаяў, каштоўнасцей. Зварот да традыцыі спрыяў актывізацыі стабілізацыйных працэсаў у культуры. Узнікненне або запазычанне новых культурных узораў выклікала інварыянтнасць культуры магнатаў, разнастайнасць яе праяўленняў. Інтэнсіўнасць міжкультурных кантактаў, аўтаматызм прымянення навацый, іх спалучэнне з традыцыямі садзейнічала дынамічнаму развіццю духоўнай культуры магнатаў Панямоння [4; 12; 14].

3. Развіццё духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння было абумоўлена этнічным, геаграфічным, палітычным, эканамічным, канфесійным, сацыяльным фактарамі. Спрыяльнае геапалітычнае (у XIII ст. – палітычны цэнтр Вялікага Княства Літоўскага, з 1569 г. – цэнтральная частка Рэчы Паспалітай) і эканамічнае (адзін з самых багатых і густанаселеных рэгіёнаў) становішча Беларускага Панямоння, пашырэнне палітычных прывілеяў і свабод садзейнічала ўзбуйненню магнацкіх уладанняў. У выніку ў прыватнаўласніцкіх рэзідэнцыях фарміравалася багатая духоўная культура. Тэрытарыяльная блізкасць да сацыякультурнай прасторы Еўропы абумовіла цеснае ўзаемадзеянне з дадзеным культурным арэалам, што праявілася ў запазычанні і інтэграцыі еўрапейскіх культурных феноменаў у мясцовую сацыякультурную практыку. Значны ўплыў на дынаміку культуры магнатаў аказаў канфесійны фактар, які стымуляваў пашырэнне выдавецкай, асветніцкай дзейнасці і інш. У цэлым дынаміка культуры магнатаў мела паступовы характар без рэзкіх скачкоў, што было абумоўлена адноснай



стабільнасцю сацыякультурнай сістэмы Беларускага Панямоння на працягу XIV – XVIII стст. [5; 11].

4. На аснове аналізу значнага фактаалагічнага матэрыялу і абагульнення тэарэтычных работ айчынных і замежных даследчыкаў была створана аўтарская перыядызацыя развіцця духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння. У гістарычнай рэтраспектыве культура прайшла наступныя этапы: фарміраванне (канец XIV – XV ст.), росквіт (XVI – XVII стст.) і трансфармаванне (XVIII ст.).

На першым этапе адбылося выдзяленне знатных родаў, пачаліся працэсы фарміравання асноўных рыс культуры арыстакратыі, складваўся маральны кодэкс, з'явілася сімволіка. Лад жыцця прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя адрозніваўся адноснай сціпласцю і меў вайсковы характар.

XVI – сярэдзіна XVII ст. сталі часам росквіту культуры магнатаў. У другой палове XVI ст. за прадстаўнікамі вышэйшай групы феадалаў Вялікага Княства Літоўскага канчаткова замацоўваецца назва «магнаты». Перыяд росквіту культуры магнатэрыі быў адзначаны панаваннем ідэалогіі сарматызму. У сарматызме сканцэнтраваліся асноўныя характарыстыкі носьбіта гэтай культуры – старажытнасць і высакародства паходжання, мужнасць і адвага, багацце і шчодрасць. Ідэалогія сарматызму дэкларавала ўсведамленне ўласнай свабоды, культ павагі продкаў, набожнасць, гасціннасць, шанаванне сямейных і сацыяльных сувязей, служэнне культу зброі.

У пачатку XVIII ст. у культуры магнатаў пачаўся перыяд трансфармавання. Змена сацыяльна-культурнай арыентацыі элітарнай часткі грамадства характарызавалася адмаўленнем ад ідэала арыстакрата-ваяра, абаронцы Айчыны. Уключэнне зямель Беларускага Панямоння ў склад Расійскай Імперыі кардынальна змяніла геапалітычную сітуацыю, спыніўшы заходні ўплыў Каралеўства Польскага з яго сталымі традыцыямі арыстакратызму. Культуры гэтага перыяду быў уласцівы як дэстабілізуючы, так і канструктыўны характар змен. Нягледзячы на крызісныя з'явы, культуратворчая дзейнасць некаторых магнатаў была накіравана на іх пераадоленне. Патэнцыял магнацкай эліты працягваў уздзейнічаць на культурныя працэсы, якія праяўляліся ў XIX ст. у рэфарматарскай дзейнасці Чартарыйскіх, Тышкевічаў і інш. [1; 2; 7].

5. У арганізацыі культурнай прасторы прыватнаўласніцкіх замкаў і палацаў Беларускага Панямоння адлюстраваліся змены, якія адбываліся ў духоўнай культуры магнатаў. Замкі-рэзідэнцыі, як буйныя прыватнаўласніцкія комплексы, актуалізавалі элітарны варыянт мастацкага асэнсавання свету. Магнаты актыўна ініцыіравалі наваўвядзенні, якія ішлі з краін Заходняй Еўропы. Гэта праявілася ў распаўсюджванні такіх з'яў заходнееўрапейскай культуры, як мецэнацтва, калекцыянаванне, стварэнне бібліятэк і архіваў, выдавецкая дзейнасць, адкрыццё прыватнаўласніцкіх тэатраў і капэл, тэатральных і музычных школ.



Рэпазіторый БДУКІ

Высокі культурны ўзровень, добрая адукацыя, шырыня светапогляду дазволіла магнатам не толькі падтрымліваць развіццё элітарнай культуры, але стаць непасрэднымі стваральнікамі культурных каштоўнасцей. У выніку культуратворчай дзейнасці ўладанні Агінскіх, Пацаў, Радзівілаў, Сапегаў, Храптовічаў і інш. ператварыліся ў буйныя сацыякультурныя цэнтры свайго часу. Запрашэнне магнатамі заходнееўрапейскіх творцаў, замежныя вандроўкі, атрыманне адукацыі ў навучальных установах краін Заходняй Еўропы спрыялі фарміраванню ў прыватнаўласніцкіх рэзідэнцыях Беларускага Панямоння элітарнай культуры, якая ўяўляла арыгінальны сінтэз мясцовых традыцый і запазычанняў [3; 6; 8; 9; 10; 15].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы і вынікі даследавання выкарыстаны ў працэсе планавання турыстычнага маршруту (акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 02.12.2009 г.), пры распрацоўцы тэатралізаванай экскурсіі па гісторыка-культурных мясцінах Беларускага Панямоння (акт аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 15.09.2010 г.).

Матэрыялы даследавання выкарыстаны ў працэсе выкладання сацыягуманітарных дысцыплін у дзяржаўнай і прыватнай установах адукацыі Рэспублікі Беларусь: у курсах «Гісторыя айчыннай культуры», «Гісторыя культурна-адпачынкавай дзейнасці», «Прыкладная культуралогія», спецкурсе «Рэгіянальныя культуры Беларусі» (акты аб практычным выкарыстанні вынікаў даследавання ад 30.10.2009 г.; 08.11.2010 г.; 22.11.2010 г.).

Матэрыялы, палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы дзяржаўнымі, муніцыпальнымі органамі і ўстановамі культуры планаў і праграм, накіраваных на захаванне і рацыянальнае выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку і такіх помнікаў дойлідства як Гальшанскі, Гродзенскі, Лідскі, Любчанскі, Мірскі, Навагрудскі замкі.

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы і рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Замкі Беларусі» на 2012 – 2018 гг.

Вынікі, атрыманыя ў дысертацыйным даследаванні, могуць стаць асновай для далейшай тэарэтычнай і практычнай распрацоўкі мадэлі сучаснага замкавага комплекса (на аснове часткова захаваўшыхся замкаў) як музея культуры магнатаў.



## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

**Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах**

1. Пацыенка, С.А. Лад жыцця жыхароў агульнадзяржаўных замкаў у Вялікім княстве Літоўскім / С.А. Пацыенка // Асновы мастацтва. – 2002. – № 1. – С. 102–112.

2. Пацыенка, С.А. Беларускія замкі як асяродак сярэдневяковай культуры / С.А. Пацыенка // Мастацкая адукацыя і культура. – 2003. – № 4. – С. 22–24.

3. Пацыенка, С.А. Планіроўка замкавых тэрыторый у Вялікім княстве Літоўскім / С.А.Пацыенка // Мастацкая адукацыя і культура. – 2005. – № 1. – С. 21–25.

4. Пацыенка, С.А. Арыстакратычная культура на беларускіх землях у XIII – XVIII стст. / С.А. Пацыенка // Роднае слова. – 2010. – № 3. – С. 107–111; № 4. – С. 89–93.

5. Пациенко, С.А. Особенности формирования духовной культуры магнатов Белорусского Понеманья / С.А. Пациенко // Вести Института современных знаний. – 2010. – № 2. – С. 91–95.

**Артыкулы ў навуковых часопісах**

6. Пацыенка, С.А. Эвалюцыя замкавых пабудоў у гісторыі беларускай культуры / С.А. Пацыенка // Архитектура и строительство. – 2007. – № 2. – С. 120–124.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

7. Пацыенка, С.А. Асаблівасці развіцця культуры вышэйшага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім / С.А. Пацыенка // Чалавек і культура : праблемы гармоніі : зб. навук. арт. асп. / БДУКМ ; рэдкал. : М.А. Бяспалая (адк. рэд.) і інш. – Мінск, 2004. – С.133–140.

**Матэрыялы канферэнцый**

8. Пациенко, С.А. Культура белорусских замков в контексте современности / С.А. Пациенко // Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе : материалы междунар. науч. конф., Гродно, 15–16 нояб. 2001 г.: в 2 ч. Ч. 2. / ГрГУ им. Я.Купалы ; отв. ред. У.Д. Розенфельд. – Гродно, 2001. – С. 248–251.

9. Пацыенка, С.А. Выкарыстанне беларускай замкавай культуры ў вучэбна-выхаваўчым працэсе / С.А. Пацыенка // Чалавек. Культура. Адукацыя : матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 14–15 ліст. 2003 г. / БелДПІК ; навук. рэд. У.П. Скараходаў. – Мінск, 2003. – С. 190–192.

10. Пацыенка, С.А. Унутраная прастора беларускіх замкаў як асяроддзе свецка-арыстакратычнай субкультуры / С.А. Пацыенка // Прырода, чалавек, культура : праблемы гармоніі : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 25–26 сак. 2003 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры ; рэдкал. : М.А. Бяспалая, І.Л. Коган, А.І. Смолік. – Мінск, 2003.– Ч. 2. – С. 122–127.

11. Пацыенка, С.А. Мірскі замак як увасабленне гармоніі вайсковага і свецкага пачаткаў у культуры Вялікага княства Літоўскага / С.А. Пацыенка // Матэрыяльная і духоўная культура замкаў Беларусі : матэрыялы рэсп. навук. канф., г.п. Мір



Репозиторий БГУКИ

Карэл. р-на Гродзен. вобл., 30 мая 2003 г. / БелДІПК ; пад агул. рэд. У.П. Скараходава. – Мінск, 2003. – С. 14–18.

12. Пацыенка, С.А. Гісторыя замкавага будаўніцтва на заходніх землях Беларусі як адлюстраванне міжкультурнага ўзаемадзеяння народаў / С.А. Пацыенка // Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе : материалы междунар. науч. конф., Гродно, 5–6 чэрв. 2003 г. / ГрГУ им. Я.Купалы ; редкол. : У.Д. Розенфельд (отв. ред.) [и др.]. – Гродно, 2003. – С. 252–254.

13. Пацыенка, С.А. Культура прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя Вялікага княства Літоўскага ў кантэксце еўрапейскай культуры эпохі Адраджэння / С.А. Пацыенка // Содружество наук. Барановичи–2005 : материалы междунар. науч.-практ. конф. молодых исследователей, Барановичи, 22 февр. 2005 г. : в 2 ч. Ч.1 / редкол. : В.И. Кочурко (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи : БарГУ, 2005. – С. 222–224.

14. Пацыенка, С.А. Мірскі замак як адзін з цэнтраў магнацкай культуры на Беларусі / С.А. Пацыенка // Мірскі замак. Канцэпцыя рэстаўрацыі і праблемы музеефікацыі : матэрыялы рэсп. навук.- практ. канф., г.п. Мір Гродзен. вобл., 16 чэрв. 2007 г. / навук. рэд. А.У. Карпенка. – Мн.: ТАА «Белпрынт», 2008. – С. 55–60.

15. Пацыенка, С.А. Магнацкая спадчына як аснова анімацыйных праграм у культурным турызме Рэспублікі Беларусь / С.А. Пацыенка // Культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., Мінск, 25–26 ліст. 2009 г. / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; рэд. савет : Б.У. Святлоў (старшыня) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 141–145.

**Дэпанаваныя работы**

16. Пацыенка, С.А. Культ зброі ў культуры вышэйшага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага / С.А. Пацыенка // Культура Беларусі ў сусветнай культурнай прасторы: традыцыйныя каштоўнасці і праблемы сучаснасці : дакл. XXXI навук. канф., Мінск, 20–21 крас. 2006 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2006. – С. 105–109. – Дэп. у ДУ «БелІСА» 04.01.2007. – № Д 20072.





## РЭЗЮМЭ

**Пацыенка Святлана Аляксандраўна**

**Дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння**

**Ключавыя словы**: дынаміка, духоўная культура магнатаў, Беларускае Панямонне, арыстакратыя, карціна свету, сістэма каштоўнасцей, сарматызм, культурная прастора, прыватнаўласніцкія замкі.

**Мэта даследавання** – выяўленне асаблівасцей дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння.

**Метады даследавання.** Метадалагічнай асновай даследавання з'яўляецца сістэмны падыход; метады: структурна-функцыянальны, гістарычнай рэканструкцыі, дыялектычны.

**Навуковыя вынікі і іх навізна.** Дысертацыя з'яўляецца першым у беларускай культуралогіі гісторыка-тэарэтычным даследаваннем дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння. Упершыню вызначана сутнасць і характэрныя рысы духоўнай культуры магнатаў; вылучаны механізмы дынамікі духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння; выяўлены асноўныя фактары, якія абумовілі дынаміку гэтай культуры; прапанавана перыядызацыя яе развіцця; раскрыта сутнасць трансфармацыі культурнай прасторы замкаў Беларускага Панямоння ў кантэксце дынамікі духоўнай культуры магнатаў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні.** Вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы дзяржаўнымі органамі заканадаўчых актаў, планаў і праграм, накіраваных на захаванне і рацыянальнае выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны; у якасці тэарэтыка-метадалагічнай асновы пры стварэнні лекцый па курсах «культуралогія», «гісторыя айчыннай культуры», «культурна-адпачынкавая дзейнасць» для сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў; для развіцця турыстычнага бізнеса краіны як пры планаванні турыстычных маршрутаў і стварэнні экскурсій, так і ў працэсе папулярызацыі гістарычных славутасцяў Беларусі.

**Галіна выкарыстання**: культуралогія, мастацтвазнаўства, гісторыя айчыннай культуры.



Репозиторий БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Пациенко Светлана Александровна**

**Динамика духовной культуры магнатов Белорусского Понемонья**

**Ключевые слова**: динамика, духовная культура магнатов, Белорусское Понемонье, аристократия, картина мира, система ценностей, сарматизм, культурное пространство, частновладельческие замки.

**Цель исследования** – выявление особенностей динамики духовной культуры магнатов Белорусского Понемонья.

**Методы исследования**. Методологической основой исследования является системный подход; методы: структурно-функциональный, исторической реконструкции, диалектический.

**Научные результаты и их новизна.** Диссертация является первым в белорусской культурологии историко-теоретическим исследованием динамики духовной культуры магнатов Белорусского Понемонья. Впервые определена сущность и характерные черты духовной культуры магнатов; выделены механизмы динамики духовной культуры магнатов Белорусского Понемонья; выявлены основные факторы, обусловившие динамику этой культуры; предложена периодизация её развития; раскрыта сущность трансформации культурного пространства замков Белорусского Понемонья в контексте динамики духовной культуры магнатов.

**Рекомендации по использованию**. Результаты диссертационного исследования могут быть использованы при разработке государственными органами законодательных актов, планов и программ, направленных на сохранение и рациональное использование историко-культурного наследия; в качестве теоретико-методологической основы при создании лекций по курсам «культурология», «история отечественной культуры», «культурно-досуговая деятельность» для средних специальных и высших учебных заведений; для развития туристического бизнеса страны как при планировании туристических маршрутов и создании экскурсий, так и в процессе популяризации исторических достопримечательностей Беларуси.

**Область применения**: культурология, искусствоведение, история отечественной культуры.





## SUMMARY

**Sviatlana Patsyenka**

**The dynamics of Magnates' Spiritual Culture of the Belarusian Region of Neman**

**Keywords**: dynamics, magnates' spiritual culture, the Belarusian Region of Neman, aristocracy. world view, system of values, sarmatism, cultural area, privately owned castles.

**The Purpose of the Research**: to identify the features of the dynamics of magnates' spiritual culture of the Belarusian region of Neman.

**The Methods of the Research**. Methodologically the study is based on the system approache; methods: structurally functional, historical reconstruction, dialectical.

**Scientific results and novelty.** The dissertation is the first historical and theoretical study of the dynamics of magnates' spiritual culture of the Belarusian region of Neman. For the first time the nature and characteristics of the spiritual culture of the magnates is defined; the mechanisms of magnates' spiritual culture of the Belarusian region of Neman are identified, the main factors behind the dynamics of this culture are revealed; periodization of its development is proposed, the essence of the transformation of the cultural area of castles in the context of the dynamics of magnates' spiritual culture of the Belarusian region of Neman is revealed.

**Recommendations for use.** Conclusions are subjects to be used by the governmental authorities to develop legislative acts, plans and programs focused on the conservation and rational use of historical and cultural heritage, as a theoretical and methodological basis for the establishment of lectures on "culturology", "the history of national culture", "cultural leisure activities" for secondary and higher education institutions, for development of travel industry in the country along with planning travel routes and creating tours and in the process of promoting historical sites in Belarus.

**Scope**: culturology, art criticism, history of national culture.


Репозиторий БГУКИ

Навуковае выданне

**Пацыенка Святлана Аляксандраўна**

**Дынаміка духоўнай культуры магнатаў Беларускага Панямоння**

**Аўтарэферат**

дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата культуралогіі
па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Репозиторий БГУКИ

Падпісана ў друк 20.06.2011 г. Фармат 60х84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 1,48.
Тыраж 60 экз. Заказ № 167.

Надрукавана на рызографе
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.